**Селядцова, М.** На прыступках стагоддзяў / М. Селядцова // Пастаўскі край. – 2006. – 2–3 верас. – С. 3.

## НА ПРЫСТУПКАХ СТАГОДДЗЯЎ

Амаль шэсць стагоддзяў назад, у 1409 г., вялікі князь літоўскі Вітаўт падарыў свайму падданаму Зіновію Братошычу грамату на перавод вёскі Пасаднік у разрад мястэчак з наданнем яму новай назвы – Паставы. З гэтай падзеяй звязана першае пісьмовае ўпамінанне пра наш горад.

Сваім развіццём Паставы абавязаны вядомаму рэфарматару, палітычнаму і эканамічнаму дзеячу Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай Антонію Тызенгаўзу. Дзякуючы яму, сёння мы можам ганарыцца шэрагам архітэктурных жамчужын. Нягледзячы на разбуральныя войны і розныя эканамічныя і палітычныя ўзрушэнні, якія перажылі Паставы з таго часу, у яго цэнтры захавалася старажытная структура рынкавай плошчы XVIII стагоддзя з унікальным барочным ансамблем, які адлюстроўвае адметны перыяд гістарычнага развіцця горада. Невыпадкова тут, у самым сэрцы Пастаў, у двухпавярховым будынку былога дома для заездаў (гасцініцы) размясціўся Пастаўскі раённы краязнаўчы музей, галоўная місія якога – збіраць, захоўваць, інтэрпрэтаваць і прапагандаваць гісторыка-культурную спадчыну краю.

Упершыню музей адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў у 1976 г. Тады ж адбылося ўрачыстае адкрыццё яго першай экспазіцыі. Але традыцыі музейнай справы ў раёне былі закладзены яшчэ ў 80-я гады XVIII стагоддзя, калі ў Паставах з’явіліся першыя калекцыйныя зборы. Карціны вядомых землякоў збіраў уладар маёнтка, падскарбій Вялікага княства Літоўскага Антоній Тызенгаўз. Справу калекцыяніравання твораў мастацтва прадоўжылі яго спадчыннікі Францыск Ксаверы Хамінскі, Ігнацій і Канстанцін Тызенгаўзы. Пры Канстанціне быў створаны своеасаблівы мастацкі музей, у якім, акрамя твораў жывапісу, былі і вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з мармуру і алебастру. Паводле звестак А. Пшэздзецкага (зяця Канстанціна), да 1840 г. у сядзібе Тызенгаўзаў знаходзілася больш за 600 экспанатаў. Сярод самых каштоўных былі карціны «Збавіцель свету» Леанарда да Вінчы, «Хвароба Анціоха» Паола Веранезе, «Партрэт мужчыны ў іспанскім касцюме» Якопа Цінтарэта, «Зняцце з крыжа» Пітэра Рубенса, «Адам і Ева» Альбрэхта Дзюрэра, «Маскарад у Венецыі» Пітэра Брэйгеля. Акрамя палотнаў заходнееўрапейскіх мастакоў, у калекцыі знаходзіліся карціны польскіх і беларускіх майстроў пэндзля: Я. Рустэма, Ф. Смуглевіча, Я. Дамеля, Ш. Чаховіча.

Пры Канстанціне Тызенгаўзе ў маёнтку быў створаны выдатны арніталагічны музей, у якім знаходзілася звыш 3000 экспанатаў чучалаў птушак і птушыных яек. Пасля смерці Тызенгаўза калекцыя арніталагічнага музея па волі нябожчыка была перададзена Віленскай археалагічнай камісіі і стала асновай арніталагічнага кабінета. А вось лёс карціннай галерэі пакуль што канчаткова не высветлены. Існуюць дзве версіі. Згодна з першай, пасля смерці К. Тызенгаўза мастацкія каштоўнасці разам з архівам былі перавезены ў Кіеў, а потым у Варшаву. Па другой, карціны і архіў яшчэ доўгі час знаходзіліся ў Паставах і толькі ў пачатку першай сусветнай вайны Рэйнольд Пшэздзецкі перавёз спадчыну Тызенгаўзаў у Варшаву.

Што датычыцца раённага краязнаўчага музея, то ён налічвае зараз каля 7000 экспанатаў. Музейны збор увесь час папаўняецца за кошт знаходак, зробленых у ходзе археалагічных даследаванняў падчас этнаграфічных экспедыцый і дзякуючы падарункам мясцовага

насельніцтва. Сучасная экспазіцыя займае два паверхі і мае аддзелы прыроды, археалогіі, гісторыі Пастаўскага раёна, Вялікай Айчыннай вайны і этнаграфіі.

Знаёмства з экспазіцыяй пачынаецца з аддзела прыроды, які дае яскравае ўяўленне аб асаблівасцях мясцовай прыроды, выкарыстанні прыродных рэсурсаў і іх ахове. Тут экспануюцца флора і фауна Пастаўшчыны: застылі ў палёце птушкі, спыніліся ў руху жывелы. Невялікі аддзел археалогіі дазваляе пазнаёміцца з культурай старажытнага насельніцтва Паўночнага Падзвіння. Не кожны раённы музей можа ганарыцца рэшткамі шкілета маманта, знойдзенымі падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Пастаўскага раена. Сярод экспанатаў – археалагічныя калекцыі кафлі XV – пач. XX стагоддзяў, старадаўнія манеты, матэрыялы па гісторыі горада, аб помніках гісторыка–культурнай спадчыны Пастаўшчыны, аб родзе Тызенгаўзаў і маёнтках, Санкт–Пецярбургскай кавалерыйскай школе, навуковай дзейнасці сусветна вядомага арнітолага Канстанціна Тызенгаўза, дзейнасці падполля і партызанскім руху на тэрыторыі раёна падчас Вялікай Айчыннай вайны, палітычных рэпрэсіях, развіцці народнай гаспадаркі ў пасляваенныя гады. У этнаграфічнай экспазіцыі – інтэр’ер сялянскай хаты, саматканыя дываны, керамічныя вырабы, калекцыя вышываных сетак і шмат іншага. Тут здзіўляюць сваёй прыгажосцю і тонкасцю вырабы з саломкі, лазы, дрэва і іншыя.

Штодня для калектыўных і індывідуальных наведвальнікаў у музеі праводзяцца аглядавыя і тэматычныя экскурсіі, падчас якіх экскурсаводы раскрываюць таямніцы пастаўскай зямлі, расказваюць пра цікавыя перыяды развіцця горада, знамянальныя даты і знакамітых асоб.

**М. Селядцова**